помніка са словамі: "Памяці салдат Войска Польскага Брэсцкага гарнізона ў 1921–1939 гг. і абаронцаў Брэсцкай крэпасці, якія загінулі ў верасні 1939 г., пахаваных на гэтых могілках. Суайчыннікі 2000".

Такім чынам, у верасні 1939 г. беларусы ўпершыню сутыкнуліся з нацысцкай агрэсіяй і разам з палякамі і ўкраінцамі паспяхова ёй супрацьстаялі. З 13 па 17 верасня 1939 г. абаронцы Брэсцкай крэпасці ўпарта стрымлівалі націск 19-га танкавага корпуса на чале з вядомым і таленавітым генералам Г. Гудэрыянам. Польскія часткі адбілі сем нямецкіх атак, якія нярэдка заканчваліся ўрукапашную. Памяць аб тых гераічных днях назаўсёды застанецца ў сэрцы беларускага, польскага і ўкраінскага народаў.

### Список цитированных источников и литературы


1. Бешанов, В.В. Брестская крепость / В.В. Бешанов. – Минск, Беларусь, 2004. – 158 с.
2. Бешанов, В. Горячий сентябрь цитадели / В. Бешанов // Брестский курьер. – 2005. – сентябрь, № 38. – С. 8-9.
3. Брестская крепость: страницы истории / сост. А.П. Кондак [и др.] – Брест: Брестский горисполком, 2000. – 28 с.
4. Галимова, Н.П. Участие воинов-белорусов в обороне Брестской крепости в сентябре 1939 г. / Н.П. Галимова // Рыжскі мірны дагавор 1921 г. і лёсы народаў Усходняй Еўропы: матэрыялы міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі (Мінск, 16-17 сакавіка 2001 г.). – Мінск, БДУ, 2001 – 210 с. – С. 115-119.
5. Грыбоўскі, Ю. Беларусы ў польскіх рэгулярных вайсковых фарміраваннях 1918-1945 гадоў / Ю. Грыбоўскі. – СПб.: Неўскі прасцяг, 2006. – 832 с.
6. Митюкова, Е. Боевое крещение Брестской крепости / Е. Митюкова // Заря (г. Брест). – 2006. – 15 июля. – С. 10.
7. Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка. Брэст: у 2 кн. – Мінск: БелТА, 1997. – Кн. 1. – 576 с.
8. Суворов, А. Брестская крепость: когда был первый бой – 22 июня 41-го? Нет, гораздо раньше / А. Суворов // Литературная газета. – 1989. – 20 сентября. – С. 15.
9. Kublicka, L. Pierwsi bronili Polacy / L. Kublicka // Glos znad Niemna. – 2000. – 19 czerwca. – S. 11.
10. Popiel, Z. Moj wrzesien / Z. Popiel // Glos znad Niemna. – 2002. – 6 wrzesnia. – S. 10.


## БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ Ў ПАРТЫЗАНСКІХ ФАРМІРАВАННЯХ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ ПАДЧАС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ


*Грыбава С.У.*
УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны універсітэт», г. Брэст


Партызанскі рух у нашай краіне, як і на ўсёй тэрыторыі СССР, насіў усенародны, інтэрнацыянальны характар. Прадстаўнікі больш 70-ці нацыянальнасцей змагаліся ў шэрагах партызан на Беларусі. Унеслі свой уклад у агульную перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі і беларускія татары. Артыкул прысвечаны ўдзелу ў партызанскім руху дадзенай нацыянальнай меншасці ў складзе партызанскіх фарміраванняў Мінскай вобласці (па адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу на 1.01.1941 г.). Артыкул у асноўным грунтуецца на матэрыялах Нацыянальнага архіва РБ (у працэсе яго падрыхтоўкі былі вывучаны архіўныя крыніцы 37 партызанскіх брыгад і асобных атрадаў). У ім прыводзіцца шэраг найбольш характэрных прыкладаў дзейнасці татар, ураджэнцаў Беларусі, у партызанскіх злучэннях Мінскай вобласці.

Беларускія татары разам з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей, якія прымалі ўдзел у партызанскім руху на тэрыторыі Беларусі, неслі ўсе цяжбы партызанскага жыцця. У атрадзе імя С.М. Кірава аднайменнай брыгады, якая ўваходзіла ў групоўку партызанскіх брыгад Мінскай зоны, змагалася цэлая татарская сям'я з Мінска: маці, Байрашэўская Марыя Канстанцінаўна (1902 г.н.) і тры яе сыны. *Брыгада імя С.М. Кірава* дзейнічала ў Чэрвеньскім, Барысаўскім, Пухавіцкім і Рудзенскім раёнах Мінскай вобласці (у дадзеным выпадку і далей па тэксту тэрыторыя дзейнасці брыгад падаецца па адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу на 1.01.1941г.). М.К. Байрашэўская, да вайны настаўніца, у атрад трапіла 5 студзеня 1944 г., дзе знаходзілася да 15 ліпеня 1944 г. Яна працавала ў гаспадарчым узводзе атрада. Да ўсіх даручэнняў ставілася з адказнасцю, праявіла сябе дысцыплінаванай партызанкай [1, л. 21а]. Ёсць звесткі аб тым, што Марыя Канстанцінаўна Байрашэўская з 8 чэрвеня 1943 г. па 1 ліпеня 1944 г. таксама выконвала функцыі сувязной разведвальна-дыверсійнай групы «Першыя» [2, л. 1-2]. За сваю дзейнасць у барацьбе з ворагам яна была ўзнагароджана медалём «Партызану Айчыннай вайны» 2-й ступені, а таксама атрымала ліст з падзякай ад камандавання партызанскага атрада [1, л. 21а]. Яе сыны Аляксандр (1921 г.н.), Канстанцін (1923 г.н.) і Уладзімір Аляксандравічы (1925 г.н.) таксама змагаліся ў атрадзе імя С.М. Кірава, удзельнічалі ў баявых аперацыях. Канстанцін у партызаны трапіў 10 ліпеня 1943 г., загінуў 19 лістапада 1943 г., па іншых дадзеных 21 лютага 1944 г. [3, л. 9; 4, л. 8]. Аляксандр з самым малодшым братам Уладзімірам вялі барацьбу з ворагам з 29 лістапада 1943 г. [3, л. 11-12], загінулі 2 мая 1944 г. падчас баявой аперацыі. Пахаваны ў брацкай магіле каля в. Лучнае ў Чэрвеньскім раёне [5, л. 8-9].

Партызанам атрада «Перамога» *брыгады імя Газеты «Праўда»*, якая дзейнічала ў Чэрвеньскім раёне Мінскай вобласці і таксама ўваходзіла ў склад партызанскай групоўкі брыгад Мінскай зоны, была татарка Зінаіда Аляксандраўна Байрашэўская (1922 г.н.). Да вайны яна працавала ў дзіцячым садку ў Смілавічах. У атрад уступіла 9 чэрвеня 1944 г., да гэтага часу была сувязной дадзенага атрада [6, л. 16]. 19 ліпеня 1944 г. пасля расфарміравання брыгады З.А. Байрашэўская была накіравана дадому [7, л. 80-81].

Варта адзначыць, што амаль палова татар, якія вялі барацьбу з ворагам у партызанскіх фарміраваннях Мінскай вобласці, змагаліся ў складзе *1-й Мінскай партызанскай брыгады*, якая ўваходзіла ў Мінскую партызанскую зону і дзейнічала ў Чэрвеньскім, Мінскім, Пухавіцкім і Рудзенскім раёнах Мінскай вобласці. Татары 1-й Мінскай партызанскай брыгады з'яўляліся ўраджэнцамі г.п. Смілавічы – аднаго з буйнейшых паселішчаў татар на Беларусі, якое размяшчалася ў Рудзенскім раёне (суч. Чэрвеньскім раёне), на тэрыторыю якога распаўсюджвалася дзейнасць брыгады.

Змагаліся беларускія татары і ў складзе фарміраванняў партызанскага злучэння Мінскай вобласці (Паўднёвай зоны Мінскай вобласці). Мінскі татарын Сцяпан Ібрагімавіч Байрашэўскі (1920 г.н.) лічыцца ў спісах партызан *3-й Мінскай партызанскай брыгады імя С.М. Будзёнага*, якая дзейнічала ў Пухавіцкім, Рудзенскім, Мінскім і Старадарожскім раёнах Мінскай вобласці. У 1941 г. ён быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію. У партызаны трапіў 28 ліпеня 1943 г. Быў узнагароджаны медалём «Партызану Айчыннай вайны» 2-й ступені. У ліпені 1944 г. захварэў тыфам і знаходзіўся на лячэнні ў гарнізонным шпіталі да 2 снежня 1944 г. Ёсць звесткі, што С.І. Байрашэўскі пасля расфарміравання брыгады быў накіраваны на працу на авіязавод [8, л. 7].

Сувязным *брыгады «Беларусь»*, якая дзейнічала ў Рудзенскім і Пухавіцкім раёнах Мінскай вобласці, з 18 кастрычніка 1943 г. быў Якаў Сафаравіч Хасіневіч (1904 г.н.). Ён разам з жонкай Галінай Селімаўнай пражываў у Мінску [9, л. 25]. На жаль, 25 сакавіка 1944 г. Я.С. Хасіневіч загінуў. Быў пахаваны ў м. Трасцянец [10, л. 41].

Татарын Мустафа Іосіфавіч Карыцкі таксама удзельнічаў у партызанскім руху на Міншчыне. Нарадзіўся ён у 1919 г. у в. Арда Клецкага раёна Баранавіцкай (суч. Мінскай) вобласці. Да вайны яго бацька выконваў функцыі мулы мячэці ў Крушнянах. Падчас нямецкай акупацыі сям'я Карыцкіх (бацька, маці Карыцкая Галіна і малодшы брат Адам) перасялілася ў Клецк [11, с. 92]. У 1940 г. Клецкім РВК Мустафа быў мабілізаваны ў Чырвоную Армію. У партызаны, у атрад імя Р.І. Катоўскага *300-й брыгады імя К.Е. Варашылава*, якая дзейнічала ў Дзяржынскім, Уздзенскім, Капыльскім, Краснаслабоцкім раёнах Мінскай вобласці і Нясвіжскім раёне Баранавіцкай вобласці, ён уступіў 3 кастрычніка 1943 г., куды трапіў з клецкай паліцыі [12, л. 13]. У адзначаным атрадзе ён змагаўся да 11 лістапада 1943 г., пасля чаго працягваў барацьбу ў складзе атрада імя Б. Хмяльніцкага [13, л. 88], створанага з 3-й роты атрада імя Р.І. Катоўскага. Падчас баявых аперацый М.І. Карыцкі праявіў сябе смелым і адважным партызанам: удзельнічаў у разгроме аўтакалонны ў накірунку Слуцк – Мінск, у падрыве чыгункі Цімкавічы-Мінск, у аперацыі па знішчэнні гітлераўцаў у в. Макавішчы, а таксама ў падрыве 7 аўтамашын [14, л. 333]. Пасля вызвалення Беларусі ад ворагу М.І. Карыцкі ў складзе Чырвонай Арміі удзельнічаў у баях ва Усходняй Прусіі. Далейшы яго лёс высветліць складана. Ёсць звесткі, што ў верасні 1944 г. малодшы сяржант Мустафа Карыцкі ваяваў у складзе 2 стралковага батальёна 950 стралковага палка. Восенню 1944 г. быў паранены [11, с. 92]. У кнізе «Памяць» Клецкага раёна згадваецца, што Карыцкі Мустафа прапаў без вестак у снежні 1944 г. [15, с. 383].

Брат Мустафы, Адам Іосіфавіч Карыцкі (1926 г.н.) таксама ваяваў. З кастрычніка 1943 г. ён змагаўся з ворагам у складзе партызанскага атрада імя Р.І. Катоўскага 300-й брыгады імя К.Е. Варашылава Мінскай вобласці [13, л. 87]. 11 лістапада 1943 г. працягваў барацьбу ў складзе атрада імя. Б. Хмяльніцкага. У баявой характарыстыцы партызана Адама Карыцкага адзначаецца, што ён праявіў сябе дысцыплінаваным байцом атрада. смела і рашуча удзельнічаў у баявых аперацыях. Ён прымаў удзел у мініраванні шашы, дзе было падарвана 3 аўтамашыны, а таксама ў 3-х баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі [14, л. 314]. 12 ліпеня 1944 г. пасля расфарміравання брыгады быў накіраваны ў шэрагі Чырвонай Арміі, ваяваў з ворагам разам з братам у 950 стралковым палку. Падчас аднаго з баёў быў паранены і кантужаны. Пасля лячэння у шпіталі ў 1945 г. быў дэмабілізаваны. Узнагароджаны медалямі і ордэнам Айчыннай вайны [11, с. 92].

У атрадзе імя Б. Хмяльніцкага 300-й брыгады імя К.Е. Варашылава з 17 лістапада 1943 г. па 12 ліпеня 1944 г. таксама змагаўся з ворагам татарын з в. Арда Клецкага раёна Баранавіцкай (суч. Мінскай) вобласці Канстанцін Аляксандравіч Карыцкі (1924 г.н.). Разам з партызанамі атрада ён удзельнічаў у «рэйкавай вайне» на чыгунцы Цімкавічы – Клецк, падчас баявых дзеянняў праявіў сябе адважным, дысцыплінаваным партызанам [13, л. 110].

Удзельнічалі ў антыфашысцкай барацьбе беларускія татары і ў складзе партызанскіх фарміраванняў злучэння Барысаўска-Бягомльскай зоны. У складзе 1-га атрада *брыгады «Жалязняк»,* якая дзейнічала ў Лагойскім і Бягомльскім раёнах Мінскай вобласці, з 1 студзеня 1944 г. знаходзіўся Якаў Сцяпанавіч Мурзіч (1926 г.н.). У партызаны ён прыбыў з в. Гайна Лагойскага раёна Мінскай вобласці, дзе пражываў разам з сям'ёй: бацькай, Сцяпанам Аляксандравічам, маці і дзвюма сёстрамі. У баявых аперацыях ён не ўдзельнічаў, займаўся гаспадарчымі справамі атрада. Усе загады камандавання выконваў дакладна і своечасова. Праявіў сябе дысцыплінаваным партызанам [16, т.2, л. 203]. Пасля расфарміравання брыгады ў ліпені 1944 г. быў накіраваны ў Чырвоную Армію, дзе працягваў барацьбу супраць ворагу [17, л. 143]. У 5-м атрадзе брыгады «Жалязняк» з 11 красавіка 1943 г змагаўся татарын з Бягомльскага раёна Мінскай вобласці (суч.

Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці) Куба Азюлевіч Мількамановіч (1911 г.н.). Да вайны – селянін. У атрадзе ён займаўся гаспадарчымі справамі: выконваў функцыі гарбара [18, л. 219]. Пасля расфарміравання брыгады, у сувязі з вызваленнем тэрыторыі Беларусі ад ворагу, быў накіраваны ў распараджэнне Бягомльскага РК КП(б)Б [17, л. 101].

Некаторыя беларускія татары знаходзіліся ў складзе 1-й Рускай нацыянальнай брыгады СС Рускай Вызваленчай Арміі пад камандаваннем былога савецкага падпалкоўніка У.У. Гіля, які прыняў псеўданім Радыёнаў. 16 жніўня 1943 г. брыгада Гіль-Радыёнава перайшла на бок партызан, атрымаўшы назву *1-я Антыфашысцкая брыгада Мінскай вобласці*. Брыгада дзейнічала ў Барысаўскім, Лагойскім, Плешчаніцкім раёнах Мінскай; Куранецкім, Плісkім, Пастаўскім – Вілейскай; Лепельскім, Ушацкім раёнах Віцебскай вобласцей. Так, у складзе 2-га атрада адзначанага партызанскага фарміравання ў якасці стралка змагаўся татарын з Докшыц Хасан Гембіцкі (1922 г.н.). Ён прапаў без вестак разам з іншымі воінамі гэтага ваеннага фарміравання 4 мая 1944 г. у час прарыву блакады ва Ушацкім раёне Віцебскай вобласці [19, л. 10-11]. Такі ж лёс напаткаў і Адама Аляксандравіча Якубоўскага (1918 г.н.), ураджэнца Міёрскага раёна Вілейскай (суч. Віцебскай) вобласці, а таксама Іосіфа Браніслававіча Смольскага (1922 г.н.) з в. Галубічы Пліскага раёна Вілейскай вобласці (суч. Глыбоцкі раён Віцебскай вобл.). Пасля пераходу ў партызаны ён змагаўся ў 5-м атрадзе 1-й Антыфашысцкай брыгады [19, лл. 31-32, 60-61]. Прапаў без вестак 4 мая 1944 г. і партызан, стралок 1-й Антыфашысцкай брыгады Смолька Хасенявіч Базарэвіч (1925 г.н.).

Густаў Міхайлавіч Раткевіч (1907 г.н.), татарын з Докшыц, таксама з 16 жніўня 1943 г. змагаўся ў складзе 1-й Антыфашысцкай брыгады, перайшоўшы на бок партызан. Да вайны ён працаваў бухгалтарам. У брыгадзе Г.М. Раткевіч змагаўся да 24 ліпеня 1944 г. За гэты час ён удзельнічаў у разгроме 9-ці гітлераўскіх гарнізонаў, 3-х засадах, 2-х аперацыях па падрыву чыгуначных шляхоў [20, л. 480]. Падчас блакады ва Ушацкім раёне 4 мая 1944 г. ён быў паранены [21, л. 258]. Пасля расфарміравання брыгады Г.М. Раткевіч працягваў барацьбу ў складзе Чырвонай Арміі [22, л. 66].

У атрадзе імя М.І. Калініна, а пазней у складзе *брыгады імя М.І. Калініна*, якая дзейнічала ў Плешчаніцкім раёне Мінскай вобласці, змагалася з ворагам татарка Феня Канстанцінаўна Радкевіч. У атрад яна ўступіла 11 лістапада 1943 г. Нарадзілася ў 1920 г. у м. Мсціж Бягомльскага (суч. Барысаўскага) раёна Мінскай вобласці. Мела сярэднюю спецыяльную (тэхнічную) адукацыю, была членам ВЛКСМ [23, л. 37-38]. Апошнім месцам яе працы ў архіўных дакументах згадваецца г. Беласток, 2-гі тэкстыльны камбінат. У атрад, а менавіта ў 2-ую роту, 2-гі ўзвод, 2-е аддзяленне яна трапіла з г. Смаргонь Вілейскай (суч. Гродзенскай) вобласці, дзе пражывала разам з роднымі [24, л. 99, 49-50; 25, л. 11-12]. У атрадзе яна праявіла сябе адданым барацьбітом за перамогу над ворагам. Удзельнічала ў баях і засадах, арганізаваных партызанамі атрада. Ф.К. Радкевіч атрымала медаль «Партызану Айчыннай вайны» 2-й ступені [26, л. 176]. 6 ліпеня 1944 г. яна была накіравана ў Плешчаніцкі раён Мінскай вобласці на партыйна-савецкую работу [27, л. 81].

У атрадзе імя Г.К. Жукава *брыгады «Штурмавая»* змагаўся татарын Браніслаў Аляксандравіч Асановіч (1910 г.н.). Брыгада дзейнічала ў Заслаўскім, Лагойскім і Мінскім раёнах Мінскай вобласці, Радашковіцкім раёне Вілейскай вобласці. У партызанскі атрад Б.А. Асановіч трапіў 1 жніўня 1943 г. з Мінску. Да ўступлення ў атрад імя Г.К. Жукава быў сувязным адзначанага партызанскага фарміравання: здабываў і перадаваў партызанам каштоўныя агентурныя звесткі па г. Мінску. У атрадзе Б.А. Асановіч знаходзіўся да 16 ліпеня 1944 г., дзе займаўся гаспадарчымі справамі: працаваў гарбаром. Работу выконваў добрасумленна, спагнанняў не меў [28, л. 6].

У атрадзе імя С.М. Будзёнага *Лагойскай брыгады «Бальшавік»* змагаўся татарын Мустафа Якаўлевіч Якубоўскі. Нарадзіўся ён у 1913 г. у г. Лагойск Мінскай вобласці. У атрадзе змагаўся з ворагам з 17 кастрычніка 1943 г. па ліпень 1944 г. Праявіў сябе дысцыплінаваным, смелым партызанам. Усе загады камандавання выконваў своечасова і дакладна [29, л. 418]. Пасля расфарміравання брыгады, у сувязі з вызваленнем тэрыторыі Беларусі ад ворагу, М.Я. Якубоўскі загадам БШПР быў накіраваны у РК КП(б)Б для далейшага размеркавання.

Татарын Сулейман Адамавіч Якубоўскі (1905 г.н.), ураджэнец м. Зембін Барысаўскага раёна Мінскай вобласці, таксама прымаў удзел у партызанскім руху на Міншчыне. Ён меў сярэднюю спецыяльную (юрыдычную) адукацыю. З 1932 г. з'яўляўся членам ВКП(б)Б. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны С.А. Якубоўскі некаторы час жыў у Камянецкім раёне Брэсцкай вобласці, дзе працаваў пракурорам. У жніўні 1941 г. перасяліўся ў г. Барысаў, дзе падтрымліваў сувязь з партызанамі. Па іх заданні ён уладкаваўся на працу да немцаў з мэтай сапсаваць тэхнічнае абсталяванне для сушкі леса, каб не даць ім магчымасць выраблядь сані. Заданне было выканана пры дапамозе ваеннапалоннага механіка. У студзені 1942 г. С.А. Якубоўскі пераехаў у м. Зембін, дзе з 2 ліпеня 1942 г. па 3 лютага 1943 г. выконваў функцыі сувязнога атрада «За Айчыну» *брыгады «Дзядзькі Колі»*. З лютага 1943 г. ён стаў членам дадзенага партызанскага фарміравання. Брыгада «Дзядзькі Колі» дзейнічала ў Барысаўскім, Смалявіцкім, Бягомльскім, Лагойскім, Плешчаніцкім раёнах Мінскай вобласці. С.А. Якубоўскі ў лютым 1943 г. удзельнічаў у баявых аперацыях атрада. З 30 красавіка 1943 г. да прыходу Чырвонай Арміі быў інструктарам падпольнага Барысаўскага РК КП(б)Б [30, л. 89]. Знаходзячыся на падпольнай працы, ён падтрымліваў сувязь з партызанамі асобнага атрада імя А.В. Суворава, які быў створаны ў верасні 1943 г. на базе расфарміраванага атрада «За Айчыну» брыгады «Дзядзькі Колі» і ініцыятыўнай групы брыгады імя П.К. Панамарэнкі [31, л. 8].

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што беларускія татары ў складзе партызанскіх фарміраванняў Мінскай вобласці ў сваёй большасці з'яўляліся ўраджэнцамі дадзенай тэрыторыі. Прадстаўнікі татарскага этнасу, пражываючага на беларускіх землях ужо больш 600-сот год, якія прымалі ўдзел у партызанскім руху, аддана змагаліся з ворагам, некаторыя былі адзначаны ўзнагародамі. Ёсць прыклады ўдзелу ў антыфашысцкай барацьбе цэлых татарскіх сем'яў. Беларускія татары, безумоўна, прыўнеслі свой уклад у агульную Перамогу над нямецка-фашысцкімі захопнікамі, змагаючыся ў шэрагах партызан, нягледзячы нават на пэўныя фактары, якія не спрыялі актывізацыі партызанскай барацьбы ў іх асяроддзі. Перш за ўсё трэба вызначыць жорсткую акупацыйную палітыку фашыстаў (пры пэўнай тэрытарыяльнай адасобленасці татарскіх паселішчаў, што палягчала магчымасць рэпрэсіўных акцый), таксама адносную нешматлікасць татарскага насельніцтва Беларусі (па перапісу 1939 г. колькасць татар у Мінскай вобласці складала 3 731 чалавек [32, с. 70-71]), што падштурхоўвала яго да самазахавання. Безумоўна, трэба прымаць да ўвагі і некаторыя іншыя гістарычныя і палітычныя фактары, у тым ліку і незбалансаванасць канфесійна-нацыянальнай палітыкі Савецкай улады. У 30-я гады XX ст. былі зачынены ці ўвогуле знішчаны ўсе мячэці на тэрыторыі Мінскай вобласці, а мулы і муэдзіны рэпрэсаваны. Канфесійная ж прыналежнасць, а менавіта веравызнанне ісламу, з'яўляецца для татар Беларусі галоўным фактарам, які спрыяў захаванню іх нацыянальнай самасвядомасці, этнічнага самавызначэння ў іншарэлігійным і іншаэтнічным асяроддзі. Тым не менш, трэба адзначыць самую вялікую актыўнасць у партызанскай барацьбе беларускіх татар на тэрыторыі Мінскай вобласці ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі іх пражывання.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**
1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НАРБ). – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 53.
2. НАРБ. – Фонд 1346. – Воп. 1. – Спр. 195.
3. НАРБ. – Фонд 1405. – Воп. 1. – Спр. 1974.
4. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 107.
5. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 6. – Спр. 26.
6. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 15.
7. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 2. – Спр. 405.
8. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 421.
9. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 6. – Спр. 17.
10. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 11. – Спр. 346.
11. Aleksandrowicz, Ch. Ksiega pamieci. Z okazji 60-lecia wyzwolenia Białorusi, zwyciestwa w Wielkiej wojnie Ojczyznianej i 120-lecia pierwszego meczetu w Klecku / Ch. Aleksandrowicz // Rocznik tatarow polskich. – 2006. – T. XI. – S. 69-105
12. НАРБ. – Фонд 1405. – Воп. 1. – Спр. 559.
13. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 41.
14. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 39.
15. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Клецкага раена / Рэдкал.: А.М. Жукоўскі [і інш.]. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1999. – 640 с.
16. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 43, ч. 2.
17. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 192.
18. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 46.
19. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 6. – Спр. 114.
20. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 129.
21. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 128.
22. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 331.
23. НАРБ. – Фонд 1405. – Воп. 1. – Спр. 1112.
24. НАРБ. – Фонд 1405. – Воп. 1. – Спр. 1115.
25. НАРБ. – Фонд 1405. – Воп. 1. – Спр. 1113.
26. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 55.
27. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 309.
28. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 105.
29. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 50.
30. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 7. – Спр. 133.
31. НАРБ. – Фонд 1450. – Воп. 5. – Спр. 273.
32. Всесоюзная перепись населения 1939 года. Основные итоги – М., 1992. –256 с.

# РАЗВИТИЕ СОДЕРЖАНИЯ КАТЕГОРИИ «МИРОВАЯ ВОЙНА» В ПОСЛЕВОЕННОЙ ПОЛИТИЧЕСКОЙ НАУКЕ

***Данилов Ю.Д.***
УО «Брестский государственный технический университет», г. Брест

Одной из характерных черт послевоенного развития политической науки стало значительное расширение использования дефиниции «мировая война» для обозначения самых различных явлений, событий, фактов. Не вдаваясь в собственно семантическое значение этого понятия, следует обратить внимание на содержание контекста «мировая война», который широко распространен не только в научной, но и публицистической литературе.